УДК 82.1

# ТВОРЫ ВАСІЛЯ ВІТКІ ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ

***К.А. Ермалёнак*** (СГК МДУ імя А.А. Куляшова)
Навук. кір. ***Т.М. Шавялёва***,
выкладчык

Васіль Вітка, беларускі знакаміты паэт, за увесь цяжкі час рэгламснтацый у літаратуры змог пазбегнуць літаратурных штампаў, чотка пазначыць сваю грамадзянскую пазіцыю, зрабіць трывалую рэпутацыю не толькі паэта, але і празаіка, драматурга, даследчыка, сцэнарыста, перакладчыка і дзіцячага пісьменніка [2].



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

В. Вітка быў упэўнены, што толькі дзякуючы фальклору, спасцігаючы паэзію народных казак, хуткагаворак, забаўлянак, лічылак, можна выхаваць у маленькага чалавека павагу да роднай мовы і любоў да Радзімы. Паэзія яго для дзяцей прасякнута светам харaства, незвычайных цікавых прыгод, поўная гармоніі і фарбаў [2]. Усе падзеі твораў для дзяцей В.Віткі накіраваны на дабрыню, на любоў, зарыентаваны на выкарыстанне фальклору, да якога пісьменнік ставіўся з незвычайным заахапленнем: “Чытаеш – радуешся, цешышся – вось багацце, якога больш чым дастаткова, каб прад усім светам ганарыцца: паглядзіце, якім поўным духоўным жыццём жыў наш народ, паслухайце, як магутна, прыгожа гучыць яго слова!” [1].

Першая казка В. Віткі “Вавёрчына гора” для дзяцей убачыла свет у 1947 г. Так здарылася, што пісьменнік прыдумаў казку для свайго васьмігадовага сына, калі яны ехалі да бабулі ў Еўлічы. Пасля казка прыняла вершаваны выгляд, і на паперы загучалі лёгкія, мяккія, хвалюючыя словы: *”Забалелі ў вавёрачкі зубкі – / Не можа раскусіць арэхавай шкарлупкі. – Плача Вера-вавёрачка: / Ой, гора маё, горачка...”.*

У гэтай казцы традыцыйна-казачнае зліваецца з уласна-аўтарскім: арганічна ўпісаліся ў сюжэт элементы сучаснага жыцця: самалёт і тэлеграф. Праўда, яны фантастычныя ад рэальных, але фашысцкі падбіты танк “тыгр” – сапраўдны. Падбіты яшчэ ў час Вялікай Айчыннай вайны, ён гібее ў балоце, ператварыўшыся ў “гару ржы”.

Мова казкі мілагучная, рытмічна разнастайная, тут шмат паэтычных паўтораў, што добра садзейнічае дынаміцы дзеяння і ўзмацняе экспрэсію. У моўную плынь талснавіта ўключаны рытарычныя пытанні, дыялогі, поўныя руху, якія вызначаюць сцэнічнасць казкі.

**Літаратура**

1. **Яфімава, М.Б.** Сее сонцам свой палетак / М.Б. Яфімава // Роднае слова. – 1996. – № 5. – С. 16–23.
2. **Навуменка, П.В**. Пошукі ўласнай сцяжыны / П.В. Навуменка // Роднае слова. 1996. – № 5. – С. 3–16.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова